# Ардэнаносны Універсітэт — 50-годдзю Савецкай улады!

ЗАКОНЧЫЛА сваю работу агульнауніверсітэцкая навуковая сесія прафесарска-выкладчыцкага саставу, прысвечаная 50-годдзю Савецкай улады. Яна яскрава прадэманстравала не толькі поспехі нашага ардэнаноснага універсітэта, не толькі высокі ўзровень яго навуковых даследаванняў, падрыхтоўкі высокакваліфікаваных, ідэйна загартаваных навуковых кадраў, але і паказала, якіх сусветна-гістарычных высотаў дасягнулі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі працоўныя краіны за гады Савецкай улады. Так, поспехі і перамогі — велічныя, яны былі адлюстраваны ў кожным дакладзе, ў кожным выступленні, закраналі яны пытанні гісторыі і філасофіі, філалогіі і юрыдычных навук, фізікі і матэматыкі, хіміі і біялогіі, геалогіі і эканомікі. На сесію было прадстаўлена каля 300 дакладаў і навуковых паведам-

## ГІСТАРЫЧНЫЯ РУБЯЖЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

ленняў. Гэта самая прадстаўнічая універсітэцкая навуковая канферэнцыя за ўсе сорак шэсць год існавання нашага вну. А вось яшчэ адна лічба, якая яскрава падцвярджае наш вывад: на сесіі працавала дваццаць тры секцыі. Ужо толькі па іх назвах можна меркаваць аб маштабах навукова-даследчай работы: секцыі тэарэтычнай фізікі, радыёэлектронікі, паўправаднікоў і цвёрдага цела, тэорыі антэн, матэматычных навук, неарганічнай хіміі, фізічнай хіміі, хіміі кардынацыйных злучэнняў, матэматычных навук, біялагічных, біёлага-геаграфічных навук, крымінальнага права, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, гістарычных навук, літаратуразнаўства, мовазнаўства, грамадскіх навук, філасофіі і іншыя.

Навуковая сесія адкрылася дакладам дацэнта В. Г. Івашына «Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Беларусі». Па мясцовай гістарычнай праблематыцы ўдзельнікі заслухалі вельмі цікавыя паведамленні аб тым, што даў наш універсітэт 50-годдзю Савецкай улады, аб развіцці народнай асветы ў Беларусі за пяцьдзесят год, аб непарушнай дружбе і ўзаемадапамозе сацыялістычных нацый і іншае. Прафесары Л. С. Абэцэдарскі, Н. П. Палецкіа, Г. М. Ліўшыц, дацэнты С. А. Умрэйка, М. І. Крукоўскі, В. А. Бадзяй А. А. Філімонаў, А. В. Царук, Р. В. Булацкі, І. С. Цішкевіч і многія іншыя расказалі шмат цікавага па тэарэтычных праблемах, гісторыі сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, аб вялізарнай ролі У. І. Леніна і створанай ім Камуністычнай партыі ў вялікіх рэвалюцыйных сусветна-гістарычных пераўтварэннях. Знамянальна, што кожнае такое паведамленне на секцыях сустракалася гарачымі апладысментамі.

Шырокапрадстаўнічымі былі секцыі прыродазнаўчых факультэтаў. Тут разам з буйнымі, вядомымі за межамі нашай краіны вучонымі выступілі са змястоўнымі дакладамі маладыя даследчыкі. Гэта сведчыць аб тым, што ў нашым універсітэце, дзякуючы клопатам партыі, урада і ўсяго народа, паўсядзённа перадаюцца слаўныя традыцыі і эстафета старэйшых пакаленняў. Яны аказваюцца ў надзейных руках. Сёлета універсітэт парадаваў краіну новымі значнымі навуковымі даследаваннямі і адкрыццямі, якія шырока ўкараняюцца ў вытворчасці. З году ў год растуць кадры навуковых супрацоўнікаў. У навуку ідзе таленавітая моладзь і гэта таму, што яе падрыхтоўкай, яе выхаваннем займаюцца ўлюблёныя ў сваю цяжкую працу вучоныя старэйшых пакаленняў. На сесіі якраз і прадэманстравалася гэтая адзінства бацькоў і сыноў, адзінства, якое з'яўляецца велізарнай сілай савецкага сацыялістычнага ладу нашай многанацыянальнай краіны. І вельмі трапна прагучалі ў сувязі з гэтым выступленні тых выкладчыкаў, якія далі дастойны адпор фальсіфікатарам і паклёпнікам з-за рубяжа. Імперыялістычная рэакцыя ў гэтыя дні шмат намагання прыкладае для таго, каб прынізіць ролю поспехаў савецкіх людзей, унесці разлад у сацыялістычнае супольніцтва, нават паміж бацькамі і сынамі. Але гэтыя намаганні дарэмныя. Навуковая сесія нашага ардэнаноснага універсітэта выказала непахісную вернасць шматтысячнага калектыва універсітэта, усяго беларускага народа Камуністычнай партыі, вялікім ідэалам камунізма.

Падводзячы вынікі гэтай кароткай справаздачы (вельмі кароткай, таму што для поўнага адлюстравання ўсёй работы сесіі не хапіла б і некалькіх нумароў газеты) хочацца пажадаць прафесарам, усім выкладчыкам новых поспехаў у навуковых даследавання і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў — актыўных будаўнікоў камунізма.

І. КРАЎЧАНКА.

## АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ВЫКОНВАЮЦЦА

Падведзены першыя вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў, прынятых калектывам выкладчыкаў і студэнтаў нашага факультэта. Работа зроблена вялікая. Напісаны і перададзены ў выдавецтва вучэбныя дапаможнікі «Геаграфія беларускіх азёр»—О. Ф. Якушка, «Лабараторныя заняткі па геадэзіі»—В. Я. Крышчановіча, Б. А. Мядзведзева і Р. А. Жмойдзяка, «Каляндар прыроды Беларусі» — А. Е. Шкляра, «Банітыроўка глебы і эканамічная ацэнка зямель БССР» — В. А. Жучкевіча, «Азербайджанская ССР» — В. Г. Заўрыева, «Геаграфія сельскай гаспадаркі Мінскай вобласці» — В. А. Навіцкага, «Прамысловасць Палесся» — В. П. Барадзіной.

Закончана работа па саставленню лімналагічных характарыстык 120 азёр для даведніка па водных рэсурсах БССР УГМС (адказная за саставленне дацэнт О. Ф. Якушка). Вялікая работа праводзіцца па падрыхтоўцы сімпозіума, прысвечанага палеагеаграфіі Беларускіх азёр (адказныя В. Г. Заўрыеў і О. Ф. Якушка).

Надрукаваны і падрыхтаваны да друку навуковыя артыкулы многімі выкладчыкамі факультэта, выданы брашуры, напісан сцэнарый для дакументальнага фільма «Агні Беларусі» В. А. Навіцкім.

Аднак яшчэ недастаткова інтэнсіўна ідзе падрыхтоўка наглядных дапаможнікаў на кафедры эканамічнай геаграфіі, геалогіі і глебазнаўства. Нездавальняюча рыхтуюцца многія выстаўкі.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 18 (670). ● ПЯТНІЦА, 19 мая 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XX





З кожным годам вучэбна-даследчыя лабараторыі універсітэта, а іх больш 80, папаўняюцца каштоўным навуковым абсталяваннем. Студэнтам ёсць дзе займацца глыбокімі і шматграннымі даследаваннямі, знаходзіць і адкрываць новае, невядомае...

На здымку нашага фотакарэспандэнта І. Аскіркі вы бачыце (злева) аспірантку кафедры мікрабіялогіі Марыну Тавелаву за даследаваннямі па тэме дысертацыі. Трэцякурснікі фізфака (здымак справа) Мікалай Кучынскі і Міхаіл Буслаў вывучаюць прынцыпы работы схем ядзернай электронікі.

## БОЛЬШ ТВОРЧАСЦІ І АГАНЬКУ!

*Закончан агляд студэнцкага насценнага друку.*

*Першае месца прысуджана газеце біялагічнага факультэта «Віта» і газеце філалагічнага—«Слова філолага».*

*На другім месцы—газета гістарычнага факультэта—«Гісторык»; на трэцім—газета геолага-геаграфічнага факультэта «Мерыдыян».*

Сёлета традыцыйны агляд насценнага студэнцкага друку ў нашым універсітэце праходзіў пад знакам дастойнай сустрэчы двух слаўных юбілеяў — 50-годдзя Савецкай улады, 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Натхнёнае вялікай урадавай узнагародай, студэнцтва нашага універсітэта прыкладае ўсе намаганні для таго, каб як мага лепш вучыцца, разнастайваць палітыка-выхаваўчую работу —наогул, каб апраўдаць давер'е партыі і народа. Гэта сказалася і на дзейнасці рэдкалегіі насценных газет факультэтаў, курсаў, груп, студэнцкіх саветаў, навуковых таварыстваў і іншых навуковых арганізацый. Больш аператыўна, шырока і змястоўна ў нашым друку асвятляюцца ўсе бакі вучэбнай, навуковай і грамадскай працы, газеты сталі выдзяляцца значна лепшым афармленнем.

Вялікім аўтарытэтам ва універсітэце карыстаюцца такія газеты, як «Слова філолага», «Віта», «Гісторык». Яны сталі паўсядзённымі памочнікамі партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый факультэтаў, часта выступаюць ініцыятарамі цікавых спраў. «Чаму я падобны на бацьку?», «Апошнія тайны старой Афрыкі» — пад такімі і іншымі прывабнымі загалоўкамі рэдакцыя газеты «Віта» сістэматычна прапагандуе навіны біялагічнай навукі і практыкі, цікавыя кнігі. Трэба сказаць, што дзейнасць такіх выступленняў вялікая. Рэкамендаваныя газетай кніжкі чытаюцца ўсімі студэнтамі факультэта, дапамагаюць ім глыбей авалодваць ведамі, звязваць іх з сучаснасцю. Наогул, «Віта» служыць прыкладам для ўсіх газет універсітэта як асвятляць дасягненні навукі, педагагічнай практыкі. Асабліва цікавыя і разнастайныя матэрыялы аб вучобе студэнтаў і аспірантаў, аб выхаваўчай працы. Заслугоўвае падтрымкі ініцыятыва рэдкалегіі па падрыхтоўцы матэрыялаў аб лепшых людзях факультэта. У «Віты» таксама можна павучыцца, як змагацца за дзейснасць выступленняў, як ставіць новыя праблемы. Газета абапіраецца ў сваёй дзейнасці на вялікі аўтарскі актыў, сярод якога — дэкан Павел Рыгоравіч Пятровіч, многія прафесары, дацэнты і радавыя выкладчыкі, а таксама аспіранты і студэнты. Пахвальна, што ў рабоце рэдкалегіі прымаюць плённы ўдзел студэнты з замежных краін, сярод якіх выдзяляецца Роберт Кейге.

Самым масавым насценны друк стаў на філалагічным факультэце. Тут, акрамя «Слова філолага», сістэматычна выпускаецца літаратурны дадатак «Маладняк», які стаў важным сродкам далейшага росту майстэрства пачынаючых паэтаў, празаікаў, крытыкаў. Вялікай папулярнасцю на факультэце карыстаюцца газеты НСО, «КП», а таксама спецвыпускі, прычым

(Працяг на 2 стар.).

(Працяг. Пачатак на 1 стар.).

# БОЛЬШ ТВОРЧАСЦІ І АГАНЬКУ!

ярка ілюстраваныя фотаздымкамі, прысвечаныя знамянальным падзеям або асобным момантам у жыцці студэнцтва.

Значна актывізавала сваю дзейнасць рэдкалегія газеты геолага-геаграфічнага факультэта «Мерыдыян». Нядрэнныя поспехі ў барацьбе за глыбокія веды студэнтаў, камуністычнае выхаванне моладзі маюцца ў насценнай газеце хімічнага факультэта. Заслугоўвае падтрымкі дзейнасць грамадскіх карэспандэнтаў у падрыхтоўцы «Камсамольскага пражэктара», які стаў асабліва дзейсным і цікавым. За апошні час адчуваецца прыкметны рост узроўню газеты «Савецкі юрыст».

Разам з тым журы адзначыла, што ў рабоце насценнага друку універсітэта маюцца і сур'ёзныя недахопы. Некаторыя рэдкалегіі яшчэ не выкарыстоўваюць усіх магчымасцей для таго, каб ператварыць насценныя газеты ў надзейных памочнікаў партыйных бюро, дэканатаў, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый ў барацьбе за падрыхтоўку высокакваліфікаваных, ідэйна загартаваных маладых спецыялістаў. Нярэдка друкуюцца шэрыя, нецікавыя матэрыялы, якія не абуджаюць думку, ні да чаго не клічуць. Асобныя нумары поўнасцю запаўняюцца сухімі справаздачамі.

Дрэнна, што не вытрымліваюцца тэрміны выпуску газет (матфак, фізфак і іншыя). Некаторыя газеты афармляюцца без творчай выдумкі, а часта нават абыякава і неахайна. Такі папрок заслугоўваюць насценгазеты матэматычнага, хімічнага і юрыдычнага факультэтаў. У гэтым напрамку трэба падцягнуцца «Гісторыку» і «Слову філолага».

Дагэтуль многія друкуемыя матэрыялы не закранаюць галоўнага ў жыцці студэнцтва, часта дрэнна рэдагуюцца, у іх маецца многа стылістычных памылак. Сур'ёзным недахопам з'яўляецца беднасць жанравай разнастайнасці. Рэдкалегіі ўсё яшчэ слаба змагаюцца за дзейснасць выступленняў і сваёй крытыкі. Толькі адна газета «Віта» сістэматычна друкуе матэрыялы па слядах крытыкі.

Журы адзначыла вельмі нізкі ўзровень выпуска насценгазеты партыйнага бюро, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый адміністрацыйна-гаспадарчай часткі.

Нядаўна нарадзілася новая газета: 5 мая выйшаў першы нумар «Голас чытача» — орган прафкома і бібліятэкі універсітэта. Журы жадае нованароджанаму плённай працы, сапраўднай творчасці і высокага майстэрства.

Вынікі падведзены. Наперадзе новыя задачы, яшчэ больш цікавыя справы. Да 50-годдзя Савецкай улады застаецца некалькі месяцаў. На парозе—сесія, працоўны семестр. Трэба прыкласці ўсе намаганні для таго, каб павысіць дзейснасць насценнага друку, яшчэ вышэй падняць яго ролю ва ўсім разнастайным жыцці нашага ардэнаноснага універсітэта.

У сённяшнім нумары нашай газеты друкуецца па аднаму матэрыялу з усіх факультэцкіх насценных газет, якія былі прадстаўлены на агляд.

# ЛЕТАПІС ФАКУЛЬТЭТА

*Насценгазета матэматыкаў «Рашым любую задачу» пачала друкаваць летапіс факультэта. У першым матэрыяле расказваецца аб яго стварэнні і развіцці ў даваенныя гады. Паведамляецца, што з 1922 года пры БДУ існавала фізіка-матэматычнае аддзяленне. Некаторы час ў якасці выкладчыкаў тут былі былыя настаўнікі гімназій і рэальных вучылішчаў. У 1929 годзе на пастаянную работу ва універсітэт прыехалі два буйных матэматыкі: былы супрацоўнік Эйнштэйна прафесар Я. П. Громер і прафесар Л. Бурсцін, з гэтага часу стала магчымым пачаць у БДУ падрыхтоўку навуковых кадраў па матэматыцы. Вялікую дапамогу ў гэтым аказалі навуковыя цэнтры краіны. Многія выпускнікі універсітэта, цяпер вядомыя буйныя вучоныя (Ф. І. Фёдараў, І. П. Шапіра, І. Г. Некрашэвіч, М. П. Шэрамец'яў і іншыя), былі камандзіраваны ў Маскву, Ленінград і іншыя гарады, дзе атрымалі выдатную навуковую падрыхтоўку. У 1938 годзе на матэматычным аддзяленні былі створаны такія кафедры, як матэматычнага аналізу, геаметрыі, тэорыі вышэйшай алгебры, механікі, дыферэнцыяльных ураўненняў.*

*Гэты артыкул заканчваецца яскравымі лічбамі аб выпуску спецыялістаў-матэматыкаў.*

*Ініцыятыва газеты па стварэнню летапісу факультэта ў сувязі з падрыхтоўкай да 50-годдзя Савецкай улады заслугоўвае шырокай падтрымкі.*

*В. КАЛЕСНІКАЎ.*



Дружнай інтэрнацыянальнай сям'ёй жывуць студэнты нашага універсітэта. Фота Ул. Старчанкі.

# СУСТРЭЧА З ЧАПАЕВЫМ



Помнік легендарнаму герою грамадзянскай вайны В. І. Чапаеву ў горадзе Чапаева.

У тыя жнівеньскія дні мінулага года наш атрад студэнтаў-цалінннікаў працаваў у Чапаеўскім раёне Уральскай вобласці. Тут у час грамадзянскай вайны граміла белаказацкія часці 25-я Чапаеўская дывізія, тут загінуў яе легендарны камандзір.

На сотні кіламетраў раскінуўся сівы стэп. А ля ракі прырода. І зусім як у Беларусі: зелянеюць дрэвы, хмызнякі. Пятляе па ўхабістай дарозе наша машына, брынчыць усімі сваімі механізмамі. Мы едзем святкаваць Дзень будаўніка ў горад Чапаеў. А думкі ў многіх з нас аб іншым. Вось хтосьці зацягнуў песню і ўсе падхапілі: «Гулял по Уралу Чапаев-герой...» Яна мацнее, плыве над стэпам, што быў сведкам рашаючых бітваў.

Мы моўчкі ўглядаемся ў пеністыя хвалі і, здаецца, бачым мужнага камдыва.

Потым мы наведалі музей В. І. Чапаева, які размясціўся ў цэнтры горада, дзе некалі быў штаб Чапаеўскай дывізіі. Багатая экспазіцыя музея адлюстроўвае гераічную барацьбу дывізі на Усходнім фронце. Вось адна з яе яркіх старонак...

Ужо другі месяц Чырвоныя атрады і добраахвотнікі мужна абаранялі горад Уральск, стрымліваючы белагвардзейцаў, якія пасля штурму горада разлічвалі зайсці ў тыл часцям Чырвонай Арміі, наступаючай на Калчака. Фрунзе накіраваў на дапамогу Уральску Чапаеўскую дывізію. Закалёныя ў жорсткіх сутычках з ворагам, натхнёныя ўзяццем Уфы, чапаеўцы гарэлі нястрымным жаданнем хутчэй прыйсці на дапамогу асаднаму гораду. Вестка аб набліжэнні Чапаеўскай дывізіі ўнесла панінку ў белаказацкія часці. Не вытрымаўшы націску наступаючых, яны спешна адступілі. 11 ліпеня 1919 года Фрунзе тэлеграфаваў Леніну: «Сёння ў 12 гадзін знята блакада з Уральска. Нашы часці ўвайшлі ў горад».

Чапаеўская дывізія пачала рыхтавацца да новых баёў: патрэбна было канчаткова разграміць адступаўшага на Гур'еў ворага.

А праз некалькі тыдняў, у ноч з 4 на 5 верасня, адбылася Лбішчанская трагедыя. Белаказакі напалі на штаб дывізіі. Вось як у той час апісваў камісар Чапаеўскай дывізіі Д. Фурманаў у газеце «Рабочы край» апошні бой В. І. Чапаева.

«...Сабраўшы чалавек дзьвесце смельчакоў, Чапаеў намагаўся прарвацца праз густы ланцуг казацкай конніцы, але патроны ўжо падыходзілі к канцу. Казакі, бачачы гэта, насядалі мацней і мацней і прыціснулі чапаеўцаў да самага берага ракі...

Чапаеў быў ранены ў руку і ў твар, але яшчэ супраціўляўся. Пасля бачылі, як ён апусціўся на зямлю, магчыма, яшчэ раз ранены, зняў боты і кінуўся ў ваду.

Больш яго не бачылі».

...Выйшаўшы з музея, мы спыніліся ля помніка В. І. Чапаеву, што ўзведзены побач. Ляглі ля падножжа букеты жывых кветак. Углядаемся ў знаёмыя з дзяцінства рысы, і на памяць прыходзяць словы Д. Фурманава пра свайго таварыша па барацьбе: «Няма больш цудоўнага камандзіра, няма больш легендарнага героя, які вадзіў свае палкі і ніколі не ведаў адступлення. Чырвоная Армія не забудзе твой подзьвіг, дарагі Чапай! Ты іскрыстай зоркай увойдзеш у гісторыю грамадзянскай вайны...».

Вялікім шчасцем было для нас пабываць у месцах, звязаных з імем В. І. Чапаева. Мы ганарымся, што будавалі Беларускую вуліцу на той святой зямлі, якую вызваляў і крапіў сваёй крывёю легендарны герой грамадзянскай вайны.

Ул. ФІЛАТАЎ,

# ТАЛІНСКАЯ НАВУКОВАЯ

Дваццаць першая навуковая студэнцкая канферэнцыя праходзіла ў памяшканні політэхнічнага інстытута. У ёй удзельнічалі прадстаўнікі ад усіх саюзных рэспублік нашай краіны. Для работы ў ёй выехалі студэнты фізічнага факультэта універсітэта Старцаў, Каськоў, Зубкоў, Лысенка і студэнт хімфака Вараб'ёў.

Цёплая сустрэча эстонскіх сяброў на вакзале, цікавая экскурсія па горадзе, а назаўтра юнакі ўжо чыталі свае навуковыя даклады і паведамленні на канферэнцыі. Было заслухана вельмі многа дакладаў. Прадстаўнікі нашага універсітэта прывезлі на гэты студэнцкі форум выдатныя даследаванні. Па меркаванню прысутных навуковыя даклады БДУ імя У. І. Леніна заслугоўваюць высокай адзнакі.

Старцаву, Каськову, Зубкову, Лысенка і Вераб'ёву былі ўручаны ганаровыя дыпломы, граматы першай ступені і каштоўныя падарункі.

«ЗА НАВУКУ» (фізфак).



*Заканчваецца навучальны год. Неўзабаве пачнуцца летнія турысцкія паходы. Але наперадзе сесія. Да яе ідуць цяпер апошнія прыгатаванні. Вы бачыце, як актыўна праходзяць лабараторныя заняткі ў студэнтаў першага курса хімічнага факультэта. І гэта не дзіўна: яны ў іх заключныя, трэба падвесці вынікі даследаванняў кожнаму за год. Для большасці студэнтаў яны былі плённымі і з'явіліся сур'ёзным укладам у далейшае авалоданне складанай прафесіяй хіміка.*

*Фота Ю. МАРОЗА.*

## НА АКТУАЛЬНУЮ ТЭМУ

На актуальную тэму «Рэвалюцыйная героіка ў савецкай літаратуры» была праведзена ў гуманітарным корпусе канферэнцыя чытачоў, прысвечаная 50-годдзю Савецкай улады. На яе быў запрошан камуніст з 1917 года, удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Васіль Сямёнавіч Пыжыкаў.

Выкладчык філалагічнага факультэта У. С. Карабан аб'яўляе адкрыццё канферэнцыі. У кароткім уступе ён гаворыць аб тым, што рэвалюцыйная героіка ў савецкай літаратуры займае адно з цэнтральных месц. Высокаідэйныя, глыбоканародныя мастацкія творы пісьменнікаў усебакова асвятляюць гераічнае мінулае і сучаснае нашага народа. У гэтым напрамку нашай літаратурай дасягнуты вялікія поспехі.

Выступленне студэнта фізічнага факультэта Георгія Ціханчука было працягам гутаркі аб літаратуры. Ён гаварыў аб вобразе Леніна ў творчасці У. Маякоўскага.

— Я ў Леніна веру...— сказаў Георгій словамі вялікага пралетарскага паэта. У вершы «Мы верым» У. Маякоўскі пісаў аб бяссмерці ленінскіх ідэй. Вялікасць Леніна — у сувязі з масамі. Наш народ будуе камунізм. Гэта шлях, на які накіраваў нас Уладзімір Ільіч. І па гэтаму шляху нас вядзе родная Камуністычная партыя. Як выдатна выказаўся паэт! «Партыя і Ленін— «блізняцы-браты». Наша цяперашняе пакаленне павінна вучыцца ў сваіх бацькоў самаму лепшаму, што прanеслі яны праз палымяныя гады рэвалюцый...

Адзін за адным выступаюць студэнты. У іх прамовах — абмеркаванні кніг, падзяка партыі, ураду, пісьменнікам, якія стварылі непаўторныя вобразы рэвалюцыйнай героікі, аб вялікім выхаваўчым і пазнавальным характары літаратуры, тэматыкай якой з'яўляецца гераічная барацьба народаў Савецкага Саюза за заваёвы Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Пад гарачыя апладысменты паднімаецца на трыбуну ветэран рэвалюцыі Васіль Сямёнавіч Пыжыкаў. Ён урачыста перадае гарачае прывітанне прысутным ад старой ленінскай гвардыі. Пасля Васіль Сямёнавіч коратка расказаў аб сабе, аб сваім удзеле ў Кастрычніцкай рэвалюцыі, аб незабыўных сустрэчах з Уладзімірам Ільічом Леніным.

У заключэнне ён падкрэсліў, што Ленін вельмі любіў мастацкую літаратуру. Хаця ён быў заўсёды заняты, але знаходзіў вольную хвіліну, каб прачытаць той ці іншы твор. Прамоўца пажадаў студэнтам і выкладчыкам з вялікім поспехам сустрэць 50-годдзе Савецкай улады.

Канферэнцыя чытачоў прайшла з цікавасцю.

**Ю. ШАРАМЕНЬ.**

**НЯДАЎНА студэнты філасофскага аддзялення завочнага факультэта абаранялі дыпломныя працы. Большасць выпускнікоў, а іх было васемнаццаць, паказала глыбокія веды па філасофскіх дысцыплінах, уменне весці навукова-даследчую работу,**

## НА ФІНІШЫ ФІЛОСАФЫ

**цесна ўвязваць свае даследаванні з запатрабаваннямі жыцця. Высокую ацэнку Дзяржаўнай камісіі (старшыня—член-карэспандэнт АН БССР Ільюшын І. М.) атрымалі дыпломныя Героя Савецкага Саюза М. Я. Зайцава, Е. К. Мусальнікава, Я. С. Бірмана і іншых выпускнікоў. Цікавую працу на тэму: «Узнікненне і развіццё катэгорый закона адмаўлення ў антычнай філасофіі» прадставіў настаўнік С. Д. Шаш. Некаторыя дыпламанты прысвяцілі свае даследаванні канкрэтным праблемам камуністычнага будаўніцтва, барацьбе за новага чалавека . У цэлым выпускнікі-філосафы даказалі, што яны атрымалі добрую падрыхтоўку ў сценах нашага ардэнаноснага універсітэта.**

**В. КАЛЯДА.**

ПЕДПРАКТЫКА.

## СПРОБА СІЛ

Прайшло пяць гадоў з тых пор, як я закончыла школу рабочай моладзі № 8 г. Мінска. Хутка ляцяць студэнцкія гады. Але за шумлівым працоўным студэнцкім жыццём я ніколі не забывала раз у год у лютым месяцы наведаць сваю любімую школу і настаўнікаў.

І вось настаў доўгачаканы дзень, калі наша студэнцкая група накіравалася на практыку ў школы горада. Для мяне гэта была двайная радасць: я трапіла ў сваю родную школу, дзе, здаецца, нядаўна сама сядзела за першай партай.

З радасцю і любоўю сустрэлі мяне нашы педагогі, а маім метадыстам стала настаўніца мовы і літаратуры, былы мой класны кіраўнік Ала Іванаўна Бароўская.

...Першы ўрок па рускай літаратуры ў дзевятым класе. Тэма — «Лірыка М. Ю. Лермантава». Хвалююся... Першы ўрок хочацца даць як мага лепш. Ала Іванаўна таксама хвалюецца: яна ўпершыню — метадыст, ёй хочацца, каб яе вучаніца дала ўрок выдатна. У гэтым яна бачыць поспехі сваёй працы. Я стаю каля настаўніцкага стала, дзе ўчора стаяла Ала Іванаўна. Гляджу на вучняў, якія вельмі ўважліва сочаць за кожным крокам маладой настаўніцы і думаю: я павінна так правесці гэты ўрок, каб поўнасцю заваяваць увагу вучняў, так паднесці новы матэрыял, каб яны і на наступных уроках слухалі мяне, як слухаюць свайго педагога. Гэтая задача — нялёгкая, але з апошняй парты на мяне глядзяць уважлівыя і добрыя вочы майго метадыста. Я адчуваю сябе больш упэўнена і пачынаю ўрок.

Не заўважыла, як праляцелі 45 мінут. Мне было вельмі прыемна, калі пасля званка вучні заявілі, што не падвядуць мяне. А ў настаўніцкай павіншавалі мяне з першым урокам дырэктар Валянціна Васільеўна, завуч Уладзімір Канстанцінавіч, настаўнікі і мой метадыст. Так пачалася мая педпрактыка ў школе.

Дырэкцыя школы, настаўнікі і Ала Іванаўна Бароўская зрабілі ўсё магчымае, каб мы, студэнты, давалі ўрокі як мага лепш. Па ўсіх пытаннях мы звярталіся да настаўніка і метадыста Алы Іванаўны. Чулая і патрабавальная Ала Іванаўна заўсёды прыходзіла да нас на дапамогу і натхняла на педагагічную працу.

Хутка праляцелі паўтара месяцы. Даны апошнія ўрокі, закончана практыка. Расстанне было сумным. За гэты час мы прывыклі да вучняў і настаўнікаў, палюбілі цяжкую, але пачэсную педагагічную працу.

Я хачу сказаць, што практыка ў школе — гэта вялікая справа! У школе мы ўпершыню спрабуем свае сілы, бачым недахопы.

Пасля практыкі мы зноў у аўдыторыі. Якая радасць сустрэла мяне, калі я даведалася, што з 28 студэнтаў нашай групы 16 здалі практыку на выдатна, а апошнія — на добра.

Я лічу, што гэтая практыка многім нашым студэнтам дапаможа стаць сапраўднымі педагогамі.

**А. ЦІЦІШЫНА,**
**студэнтка 5 курса вячэрняга аддзялення рускай мовы і літаратуры.**



Перад залікам.
Фота А. Кадзета.

## КЛЯТВА

Дні цякуць, як вада, цёмная вясенняя вада, жывая і моцная. Непрыкметна прабягаюць яны, змяняючы вячэрнюю цемру на ранішні досвітак. Многія з іх не пакідаюць у памяці нічога такога, што пакідае след ва ўсім жыцці. Але бываюць такія, пасля якіх адчуваеш: усё жыццё раптам змянілася і ты стаў іншым. Адчуваеш, як пасталеў ты за гэты дзень.

Ах, гэтая сталасць! Як нам, дзяўчынкам, хочацца хутчэй пасталець! Ці заўважалі вы, з якім захапленнем і любоўю глядзяць малыя ў белых фартушках на сваіх старэйшых сясцёр. Іх вочы так і кажуць: «Ну хутчэй бы вырасці, стаць такімі, як яны. Гэтыя паветраныя багіні на шпільках! Ах, гэтая школа, калі ж яе толькі можна будзе закончыць!»

І ўсё ж гады цякуць, цякуць няўмольна, не марудзячы і не паскараючы свой бег. І вось апошні званок, апошні школьны бал, апошні школьны вальс і світанне над рэчкай. Халоднае дрыжанне ад холаду і хвалявання — якое яно новае жыццё? Дзяўчынкі, школьніцы ў душы, мы ўздрыгвалі ад званка пад'ёмнага крана: ён зусім як наш, школьны. Мы свабодны ад урокаў, ад збору металалому, ад піянерскіх лінеяк. Але дзе яна, тая нецярплівасць, з якой мы рваліся са школы? Яе няма. І паступова, зусім непрыкметна для нас, у клопатах, надзеях, разачараваннях у душы нараджаецца смутак па дзяцінству, па чырвоных гальштуках, па белых банціках на святы.

Быў адзін з тых «неўраўнаважаных» вясенніх дзён, калі неба то смяялася, то плакала. Я выйшла з універсітэта поўная турбот. Гэтыя вечныя клопаты...

І раптам сэрца ўздрыганула, зашчыміла такім салодкім, такім знаёмым смуткам. Піянерская труба... Замігацелі сцягі і піянеры, важныя і сур'ёзныя, падыйшлі да помніка У. І. Леніну. Мне здалося, што сэрца маё не вытрымае: так моцна мне захацелася стаць маленькай дзяўчынкай з чырвонай зоркай на грудзях! Я нават адчула на далонях салодкае цяпло пралесак. Праходзячыя са здзіўленнем глядзелі на мяне, а я і не заўважала, што па маіх шчоках цякуць слёзы. Я стаяла і глядзела. І нават неба падалося маймy настрою, яно засвяціла яркім сонцам.

Я слухала гэты дзіцячы шум, углядвалася ў сканцэнтраваныя твары хлопчыкаў і дзяўчат. Бэзавая пушыстая горка расла і расла ля ног Ільіча, і раптам, як калісьці ў дзяцінстве, каля Маўзалея, я адчула вострую неабходнасць даць клятву: «Дарагі дзядуля Ленін! Я абяцаю табе быць вернай дзяцінству, быць вернай сваёй клятве і жыць па тваіх запаветах. Хай мінула дзяцінства і не падыходзіць старая клятва, я скажу цяпер новую, пасталелую, юнацкую».

**Т. ЧУРСІНА,**
**студэнтка першага курса біяфака.**

## САРДЭЧНАЯ ЎДЗЯЧНАСЦЬ

**Рэктар Беларускай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчай акадэміі К. М. Сонцаў, сакратар парткома Ф. К. Курапаценка, старшыня мясцкома Н. А. Шылаў, сакратар камітэта камсамола Ф. Я. Маціна і старшыня прафкома М. М. Корж нядаўна прыслалі на імя рэктара нашага універсітэта А. Н. Сеўчанкі пісьмо, у якім, у прыватнасці гаворыцца: «Калектыў навуковых супрацоўнікаў, студэнтаў, рабочых і служачых Беларускай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчай акадэміі ў захапленні ад выступлення аркестра народных інструментаў вашага універсітэта. Шчыра віншуем са стварэннем такога аркестра, сардэчна дзякуем за дастаўленую радасць. Жадаем гэтаму цудоўнаму калектыву і яго кіраўнікам. яшчэ большых творчых поспехаў у юбілейным годзе. Вялікае дзякуй!»**

# З НАМІ ВУЧАЦЦА В'ЕТНАМСКІЯ СЯБРЫ

У гэтым навучальным годзе на першым курсе хімічнага факультэта нашага вну навучаецца пяць в'етнамскіх студэнтаў: До Мань Ханг, Чан Кім Мон, Нгуен Хыу Чы, Дзінь Тхі Кух, Нгуен Тхі Нгы. Яны прыехалі ў нашу краіну, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Усе яны з'яўляюцца выхадцамі з простых сялянскіх і рабочых сем'яў. До Мань Ханг і Чан Кім Мон ужо самі працавалі, настаўнічалі. Цяжкім было жыццё Дзінь Тхі Кух, Нгуен Тхі Нгы і Чан Кім Мона. Раней яны жылі ў Паўднёвым В'етнаме. Бацькі Тхі загінулі ад рукі ворагаў в'етнамскага народа.

В'етнамскім студэнтам вельмі прыйшоўся да спадобы выдатны, тэхнічна абсталяваны наш універсітэт, яго цудоўныя аўдыторыі, дзе можна рабіць багатыя даследаванні па хіміі. Але, каб рабіць іх, замежным студэнтам спачатку прышлося засесці за слоўнікі. Прыходзілася вельмі цяжка, але напружаная праца прынесла доўгачаканы плён. Руская мова паспяхова авалодана, і ўжо прайшлі першыя паспяховыя лабараторныя работы. Юнакі і дзяўчаты з В'етнама вераць, што атрымаюць высокую адукацыю ў нашым універсітэце.

Падабаюцца в'етнамцам і прыгожыя мінскія вуліцы, новыя кварталы, шматпавярховыя дамы, тэатры, музеі, якія яны часта наведваюць. Радуе іх таксама і тое, што ў горадзе многа новабудоўляў. У захапленні яны і ад мінчан, вясёлых, гатовых заўсёды прыйсці на дапамогу кожнаму.

В'етнамцы не забываюць ні на хвіліну сваю гераічную Радзіму, якая праходзіць зараз цяжкае выпрабаванне. Яны ўпэўнены, што в'етнамскі народ пераможа. Мы вельмі цесна пасябравалі з імі. Яны любяць нас, а мы іх. Яны расказваюць нам цікавыя гісторыі аб жыцці ва В'етнаме, пабудове сацыялізма, аб гераічнай барацьбе супраць амерыканскіх агрэсараў. Мы заўсёды побач, дапамагаем чым толькі можам в'етнамскім студэнтам у авалоданні складаных ведаў і ўпэўнены, што яны вернуцца на Радзіму спецыялістамі высокага класу.

В. МАРЦІНОВІЧ.

«Хімік»



Першы Дзяржаўны экзамен па гісторыі КПСС здала група студэнтаў чацвёртага курса гістарычнага факультэта. Гісторыкі паказалі добрае веданне прадмета.

# ДЗЯЎЧАТЫ З 304

Я закахана ў дзяўчат з нашага пакоя, нават і не ведаю, якой з іх аддаць, перавагу ў гэтым. Канешне, першым чалавекам пакою мы лічым нашага дастойнага старасту Валю Саламаху. Мілая Саламашка, добрая і старанная, рамантычная і сур'ёзная! Валя любіць усякую работу, захапляецца вершамі, а таксама «сваім Герцэнам». Яна іншы раз робіцца злой, здорава дастаецца ў гэты час дзяжурнаму «ратазею», калі наша«старасціха» выявіць пыл. Эх, гэтая Саламашка! Не дарма яе ў групу народнага кантролю выбралі. Нашай маці мы лічым Машу Шаблінскую. Не па ўзросту,—па нейкаму праз меру пасталеламу характару. Маша вельмі сур'ёзная і сумленная дзяўчынка. Любіць мастацтва ведае ўсё аб сваіх любімых мастаках. Яшчэ Маша мае і свае цалінныя заслугі, яна двойчы ўзнагароджана за ўдзел у цалінных будоўлях, і, канешне ж, Толік Траскуноў не шкадуе, што жаніўся на нашай Машы. Цяпер вазьмуся за Ларысу Дзядзёнак, нашу добрую, мілую «малютку». Толькі яна вельмі патрабавальная да сябе.

Затым Зоя Зуева. Гэта чалавек, які не зусім ўнушае «давер'е». Яе старанныя заняткі французскім выклікаюць у мяне думку нейкага страху. Зоя і французскі—непадзельны. Пяты член нашага калектыва —гэта я.

Я вельмі добрая дзяўчынка, люблю Сяргея Ясеніна, я вельмі прыгожая... Сам сябе не пахваліш... Ах, гэткай бяды...

Г. ШАЎЧЭНКА,
стараста трэцяга курса.
«Гісторык».

# ЯКІМ ТЫ БУДЗЕШ, ПРАЦОЎНЫ СЕМЕСТР?

Вось і наступіла доўгачаканая вясна, а разам з ёй перад кожным студэнтам паўстала пытанне, як правесці лета, куды паехаць?

І не бяда, што да канікул яшчэ шмат часу, а наперадзе нас чакаюць экзаменацыйныя баталіі. Усё роўна аптымістычна насторены студэнт ужо ў думках прадстаўляе сябе сярод узведзеных яго рукамі сакляў і вырытых арыкаў у казахскіх стэпах. Увогуле, работы непачаты край, і кожны з нас мае магчымасць грунтоўна падмацаваць свой бюджэт, якога студэнту часам так не хапае. У гэтым годзе наш факультэт павінен сфарміраваць пяць атрадаў па 25 чалавек. А ўсяго на будоўлі краіны павінны паехаць 235 студэнтаў-юрыстаў.

Тры атрады накіроўваюцца на два месяцы ва Уральскую вобласць, а два другіх будуць працаваць у Беларусі. Адзін — у саўгасе Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці, другі — на будоўлі лаўсанавага камбіната ў горадзе Магілёве. Па Беларусі работы будуць закончаны да 15 жніўня. Па камсамольскіх пуцёўках раз'едуцца ў піянерскія лагеры Мінскай вобласці важатыя і выхаванцы піянераў. Камітэт камсамола арганізуе для іх своеасаблівую практыку і знаёмства з будучай работай праз піянерскую дружыну школы № 102 горада Мінска.

У складзе зводных універсітэцкіх атрадаў будуць працаваць тыя рабяты, якія пажадалі паехаць на Мінскае мора, на будоўлю гасцініцы «Юнацтва», на будоўлю «Зубронка» на Нарачы.

Многія студэнты будуць адпачываць і набірацца сіл у спартыўна-аздараўленчым лагеры універсітэта.

А лепшыя нашы сябры — студэнты другога курса Х. Ягудзіна і С. Жышко рэкамендаваны камітэтам камсамола і партбюро для паездкі ў Чэхаславакію.

І ўсё ж, нягледзячы на вялікі выбар, многія студэнты лічаць, што прадстаячая работа іх не датычыцца. Так, 30 студэнтаў 2-га курса да гэтай пары не падалі заяў. Калі гаварыць аб першакурсніках, то трэба заначыць, што многія з іх хочуць абмежавацца толькі працай тэрмінам у 10 дзён. А некаторыя студэнты дык і зусім не падалі заяў.

Да гэтага часу ў нас не сфарміраван атрад на сельскую будоўлю Беларусі. Недакамплектаваны атрад у горад Магілёў. Ствараюцца такія абставіны, што камітэт камсамола павінен звярнуцца за дапамогай у дэканат і партыйнае бюро. Кожнае звальнене ад працоўнага семестра будзе вырашацца строга ў індывідуальным парадку.

Тым камсамольцам, якія яшчэ не паспелі зрабіць выбар, будзе ўручана камсамольская пуцёўка, таму што працоўны семестр юбілейнага года з'яўляецца ўдарным. Як і ва ўсіх вну рэспублікі камсамольскі сход нашага факультэта падтрымаў рашэнне Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і ЦК камсамола аб абавязковым удзеле студэнтаў у летнім працоўным семестры. Для студэнтаў-юрыстаў не да твару такая пастаноўка пытання, таму што яны самі павінны растлумачваць іншым важнасць і неабходнасць гэтай кампаніі.

ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ЮРФАКА. «САВЕЦКІ ЮРЫСТ».



Практычныя заняткі ў студэнтаў- журналістаў.

# ДЭКАНАТ НЕ ЗАЦВЯРДЖАЕ

Набліжаліся радасныя дні. Студэнт Абломкаў марудна рухаўся ў бок свайго факультэта. Ён ніколі не спяшаўся. Сёння ж у яго былі асаблівыя прычыны не спяшацца. На першую лекцыю ён усё роўна спазніўся, да пачатку другой яшчэ паспее. Праспаў трошкі. «Ну, і што?,—думае Абломкаў,—усё лекцыі, лекцыі, і адпачыць няма калі». Затое ж горад рыхтаваўся да свята, на вуліцах развешвалі сцягі, на плошчы маладцавата маршыравалі аркестранты. Чулася музыка і заўважалася агульнае ажыўленне. «Што робіцца? Га-а-а?—захапляўся Абломкаў.—Што робіцца?» Яму заўсёды былі да спадобы такія прыгатаванні. У такія дні выкладчыкі не вельмі злыя, старасты забываюць адзначыць адсутных. Рай нябесны, ды і толькі!

Насустрач Абломкаву ішоў моцна складзены мужчына ў паліто і шляпе. «Дэкан!» — затрасло ў каленках нашага студэнта.—Думаць няма калі. Трэба хутчэй ратавацца...»

У адно імгненне Абломкаў аказаўся за ствалом вялізнага дрэва. Прайшло некалькі трывожных мінут. Абломкаў асцярожна выглянуў на дарогу. Праходзячы мінуўшы дрэва, пайшоў у бок праспекта. «Ну, цяпер пара»,—падумаў студэнт і кароткімі перабежкамі пусціўся да выхаду са сквера.

— На лекцыі спяшаецеꞏ?—пачуў Абломкаў добра знаёмы голас. Перад ім стаяў дэкан. Гэта была не здань, гэта быў жывы дэкан факультэта. Ён, вядома, усё разумее. Што ж сказаць?

— А я вас шукаў,—прыйшла думка Абломкаву.—Разумееце: скрозь сцягі, плакаты... Добра было б у нас, на факультэце...

— Вось вы і займіцеся гэтым,—сказаў дэкан,—а я пайду, на Вучоны савет выклікаюць...

— Ідзіце, ідзіце,—неяк неўпапад залепятаў Абломкаў. На факультэт ён прыйшоў ледзь валочачы ногі.

На другі дзень Абломкава сустрэў сакратар камітэта камсамола:

— Ты ведаеш: тваю заяву на паездку дадому дэканат не падцвердзіў.

— Чаму?

— Не ведаю. Ідзем разбярэмся разам.

Дэкан знаходзіўся ў сваім кабінеце.

— Так вы ведаеце, таварыш Абломкаў, мы ўключылі вас у састаў камісіі па падрыхтоўцы да свята. Пярэчанняў, спадзяюся, не будзе?

Пярэчанняў не было.

М. ПЯТРОЎ.

«Слова філолага»

# АБАВЯЗКОВА ЦІ НЕ?

На трэцім курсе факультэта быў праведзен камсамольскі сход. Матэматыкі вырашалі надзённае пытанне. З самага пачатку семестра наведванне лекцый трэцякурснікамі рэзка пагоршылася. Чаму склалася такое становішча? Адказаць на гэтае пытанне рэдкалегія папрасіла члена камсамольскага бюро курса Генадзя Кургеля.

— На мой погляд, прычына крыецца ў тым, што адбылося размеркаванне курса па кафедрах. У выніку стварыліся новыя групы, у якіх яшчэ не наладзілася сапраўдная таварыскасць і дружба. У сувязі з перастаноўкай аслабіўся і ўплыў камсамольскай арганізацыі. Па прапанове дэканата быў праведзены сход камсамольскага актыву. Тут было намечана многа канкрэтных мер, накіраваных на паляпшэнне наведвання лекцый. Вынеслі некалькі спагнанняў — у двух, найбольш ярых прагульшчыкаў, знялі стыпендыі, некаторым вынеслі строгія вымовы. Мне задаецца, наведванне лекцый будзе паляпшацца толькі тады, калі неаслабная работа ў гэтым кірунку будзе весціся кожным актывістам...

А якое меркаванне наконт гэтага радавога студэнта?

— Па-першае, наведванне лекцый не павінна быць абавязковым. Людзі дарослыя, а калі хто-небудзь больш эфектыўна можа працаваць дома,—нечага гэтаму пярэчыць. Па-другое, у гэтым семестры вельмі вялікая акадэмічная нагрузка: шэсць экзаменаў і тры залікі. Само сабой напрашваецца пытанне: навошта столькі экзаменаў? Каштоўней, відаць, веды, а не экзамены.

На сходзе не было прынцыповай, шматграннай гутаркі аб дадатных і адмоўных баках абавязковага наведвання лекцый студэнтамі. Хіба не трэба пачаць гаворку на курсах аб плюсах і мінусах вольнага наведвання лекцый?

«РАШЫМ ЛЮБУЮ ЗАДАЧУ» — МАТФАК

АТ 13439 Адрас рэд: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 206, тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 868. Рэдактар М. І. ІОСЬКА.